# Усім райпарткомам і райвыканкомам

ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначаюць зусім нездавальняючае разгортванне сяўбы па БССР: на 15 красавіка засеяна 100.000 га, у той час, калі ў мінулым годзе на гэту дату было засеяна да 150.000 га. Асабліва недапушчальна разгортванне работы па сяўбе ў раёнах Бялыніцкім, Крычаўскім, Шклоўскім, Хоцімскім і Чаўскім.

Разам з гэтым з матэрыялаў паступаючых з раёнаў зусім бачна, што замест барацьбы за разгортванне сяўбы прадаўжаюцца ўсемагчымыя пасяджанні, выезды і раз'езды раённых работнікаў па пытаннях не звязаных з сяўбой.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР лічаць, што такое становішча з ходам сяўбы сведчыць аб тым, што раённыя арганізацыі не ўзяліся па-сапраўднаму за сяўбу. Адначасова ЦК і СНК звяртаюць асаблівую ўвагу райпарткомаў і райвыканкомаў, што побач з правільным разгортваннем тэмпаў па сяўбе не следуе ўпускаць якасць, што мела месца ў Чашніках улічваючы, што 1935 год па якасных паказальніках сяўбы павінен быць вышэй за ўсе папярэднія гады.

ЦК і СНК лічаць неабходным камандыраваць у рад раёнаў, слаба разгарнуўшых работу па падрыхтоўцы і разгортванні сяўбы, а таксама па пытаннях калектывізацыі, рад цэнтральных кіруючых работнікаў.

ЦК і СНК прапануюць РК і РВК зрабіць вынікі з гэтай дырэктывы, прыступіўшы зараз-жа к разгортванню масавай сяўбы.

ЦК і СНК даручаюць цэнтральнаму друку — «Звяздзе» і «Рабочему», а таксама раённаму разгарнуць на старонках друку шырокае асвятленне пытанняў сяўбы, у асаблівасці ўлічваючы неабходнасць барацьбы за якасць сяўбы.

**ГІКАЛО.**

**ГАЛАДЗЕД.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ